Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 16 ЧЭРВЕНЯ 1977 г.

№ 22 (1172)

Цана 2 кап.

## НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да выбараў народных дэпутатаў на выбарчым участку № 32.

19 чэрвеня тут аддадуць свае галасы за прадстаўнікоў народа больш за 900 выбаршчыкаў, 80 юнакоў і дзяўчат прымуць удзел у выбарах упершыню.

А пакуль што праводзяцца падрыхтоўчыя мерапрыемствы. У агітпункце выбарчага ўчастка прачытаны лекцыі па савецкаму заканадаўству, адбыліся сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, абмяркоўваўся праект новай Канстытуцыі СССР.

Вялікую работу праводзяць агітатары з маладымі выбаршчыкамі. З гутаркамі выступілі агітатары А. В. Шыдлоўскі, К. С. Гарупа, Ю. М. Калінін.

* * *

**13 чэрвеня на выбарчым участку № 32 у памяшканні НДІ ПФП адбылася сустрэча выбаршчыкаў з другім сакратаром Маскоўскага райкома КПБ Пятром Георгіевічам Нікіценкам. Мерапрыемства праходзіла па плану сустрэч выбаршчыкаў з партыйнымі і савецкімі кіраўнікамі напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы. Пётр Георгіевіч зрабіў паведамленне аб перспектывах развіцця Маскоўскага раёна беларускай сталіцы, адказаў на шматлікія пытанні прысутных. Сустрэча прайшла на высокім арганізацыйным узроўні.**

**А. ЛІТВІНЕНКА,**
**кіраўнік агітпункта.**

# АГЛЯД НАВУКОВЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ

Эфектыўнай формай удзелу маладых вучоных у распрацоўцы актуальных праблем грамадскіх навук, якія вызначаны рашэннямі XXV з'езда КПСС, пастановамі ЦК КПСС, сталі ўсесаюзныя конкурсы работ маладых вучоных па грамадскіх навуках. Яны арганічна ўвайшлі ў практыку работы камітэтаў камсамола, саветаў маладых вучоных ВНУ, інстытутаў АН СССР, акадэмій навук саюзных рэспублік, Акадэміі педагагічных навук СССР.

IV Усесаюзны конкурс работ маладых вучоных па грамадскіх навуках праходзіў у адпаведнасці з пастановай ЦК ВЛКСМ, Акадэміі навук СССР, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Міністэрства асветы СССР, Акадэміі педагагічных навук СССР ад 6 мая 1975 года.

У нашай рэспубліцы была прынята адпаведная пастанова, створаны аргкамітэт, распрацаваны і здзейснены канкрэтныя мерапрыемствы па забеспячэнню актыўнага ўдзелу ў конкурсе маладых выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў. Работы, якія вылучаліся на конкурс, абмяркоўваліся на пасяджэннях вучоных саветаў, кафедр, саветаў маладых вучоных навуковых устаноў, ВНУ.

Актыўны ўдзел у конкурсе прынялі таксама і маладыя вучоныя БДУ імя У. І. Леніна.

Конкурс праходзіў у два туры. Першы тур быў завершан у маі 1976 года рэспубліканскай канферэнцыяй. У канферэнцыі ўдзельнічалі маладыя вучоныя БДУ з кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў, кафедры гісторыі філасофіі і логікі, кафедры навуковага камунізму, кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму, маладыя вучоныя юрыдычнага факультэта.

Пераможцамі IV Рэспубліканскага конкурсу маладых вучоных па грамадскіх навуках сталі:

А. М. Байчораў (I ступень, «Праблемы кансалідацыі дэмакратычных сіл ЗША ў сучасных умовах»).

П. І. Бондар (II ступень, за цыкл артыкулаў аб дзейнасці КП Беларусі па павышэнню ролі сельскіх культурна-асветных устаноў у камуністычным выхаванні працоўных, 1956—1961 гг.).

Н. Г. Кісель (I ступень, «Філасофскае значэнне прынцыпу дадатковасці»).

Л. П. Будынава, Ж. М. Грышчанка, Л. А. Саглаева (II ступень, «Метадалогія і методыка даследавання праблем сацыялістычнага спаборніцтва ў працоўным калектыве»).

Н. М. Абрамава, Г. М. Кучынскі, В. М. Хоміч атрымалі дыпломы III ступені.

Работы, прадстаўленыя на II тур конкурсу, пасля разгляду ў экспертных камісіях былі накіраваны на рэцэнзаванне ў вядучыя навуковыя ўстановы, ВНУ Масквы. У лістападзе 1976 — студзені 1977 гг. адбыліся падагульняючыя пасяджэнні экспертных камісій. Па рэкамендацыях экспертных камісій аргкамітэт вылучыў 37 лепшых работ маладых вучоных для прадстаўлення іх аўтараў да ўзнагароды дыпломамі лаўрэатаў. Сярод лаўрэатаў IV Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках маладыя вучоныя БДУ імя У. І. Леніна кандыдат гістарычных навук ст. выкладчык П. І. Бондар і выкладчык Н. Г. Кісель, якія паспяхова спалучаюць плённую навуковую работу з актыўным удзелам у грамадскім жыцці.

Вынікі IV Усесаюзнага конкурсу маладых вучоных па грамадскіх навуках сведчаць аб тым, што маладыя вучоныя БДУ імя У. І. Леніна актыўна ўдзельнічаюць у распрацоўцы актуальных праблем грамадскага жыцця. З мэтай павышэння ўзроўню даследаванняў, а таксама ўдасканальвання вывучэння марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковага камунізму, палітычнай эканоміі, канкрэтнай эканомікі, гісторыі КПСС, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху, гісторыі права, псіхалогіі, педагогікі і праблем камуністычнага выхавання моладзі ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах ЦК ЛКСМБ сумесна з Акадэміяй навук БССР, Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Міністэрствам асветы БССР праводзіць у 1977—1978 г. V Рэспубліканскі конкурс работ маладых вучоных па грамадскіх навуках, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў.

Рэктарат, партыйны камітэт, камітэт камсамола і савет маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна лічаць маючы адбыцца конкурс аглядам навуковых дасягненняў кафедр БДУ.

Работы накіроўваць праз савет маладых вучоных БДУ і камітэт камсамола БДУ. У сектары інфармацыі і друку савета маладых вучоных можна азнаёміцца з саставам аргкамітэта конкурсу, з парадкам афармлення суправаджальных дакументаў.

**А. ЦІТОВА.**
**(Сектар інфармацыі і друку савета маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна)**

Палажэнне аб V Рэспубліканскім і V Усесаюзным конкурсе работ маладых вучоных па грамадскіх навуках чытайце на 2-й стар.

**У ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ, ПРЫСВЕЧАНАЙ 60-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА, ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ ВЫКЛАДЧЫКІ КАФЕДРЫ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ФІЛАСОФІІ ГУМАНІТАРНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ УНІВЕРСІТЭТА І ПОЛЬСКІЯ СТУДЭНТЫ, АСПІРАНТЫ, КОНСУЛ ПНР У МІНСКУ КАЗІМЕЖ НОЦУНЬ.**

З дакладамі выступілі польскія студэнткі, якія навучаюцца ў Белдзяржуніверсітэце на філалагічным факультэце,— Івона Рэк, Ядзвіга Мікутовіч, Ірэна Федарук, а таксама аспіранты БДУ з ПНР Зігмунд Домбек, савецкія студэнты Сяргей Кузьмін і Уладзімір Трамбіцкі. Галоўная тэма іх выступленняў — барацьба за мір, бяспеку, ідэалагічная барацьба на сучасным этапе.





Перад удзельнікамі канферэнцыі з успамінамі аб ваенных гадах выступілі ўдзельнікі вызвалення Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў былы лётчык, Герой Савецкага Саюза Мікалай Якаўлевіч Зайцаў і былы разведчык Іван Якаўлевіч Пісарэнка.

— Правядзенне такой канферэнцыі з'яўляецца першым вопытам нашай кафедры, — расказвае намеснік загадчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі кандыдат філасофскіх навук Віктар Іванавіч Аўчарэнка. — Прайшла яна на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні, шмат чаго дала ўдзельнікам як у пазнанні жыцця, так і ў вывучэнні некаторых праблем філасофіі і асабліва такіх, як праблема вайны і міру.

Цікава тое, што ўдзельнікі канферэнцыі пазнаёміліся з непасрэднымі ўдзельнікамі другой сусветнай вайны. Вельмі цяжка пераацаніць значэнне эмацыянальнага ўздзеяння, якое даў як бы практычны разгляд праблем вайны і міру з дапамогай непасрэдных удзельнікаў вайны. Гэта асабліва важна таму, што мы працуем з моладдзю, вучым яе, а побач з вучобай павінны і выхоўваць. Правядзенне такіх канферэнцый, на мой погляд, вельмі карыснае.

Наш вопыт не апошні. Кафедра зараз плануе падобную сустрэчу правесці ў г. Салігорску ў самы бліжэйшы час.

Консул ПНР у Мінску Казімеж Ноцунь павіншаваў удзельнікаў з поспехам і ўручыў каштоўныя падарункі — значкі і кнігі аб Польскай Народнай Рэспубліцы.

**Л. НОВІКАЎ.**

На здымках: у прэзідыуме; удзельнікі канферэнцыі слухаюць з увагай.

Фота У. КАРАГІНА.

ПА БДУ ІНФАРМАЦЫЯ

## На паверцы — гатоўнасць СБА

Апошні свой савет трымалі кіраўнікі студэнцкіх будаўнічых атрадаў Мінскай вобласці на семінары, які адбыўся ў нашым універсітэце.

Перад камандзірамі і камісарамі будатрадаў выступілі з дакладамі сакратар абласнога камітэта ЛКСМБ Р. Давідовіч, прадстаўнік Рэспубліканскага штаба СБА І. Ман, камісар абласнога штаба СБА М. Ціцянкоў. У дзелавой абстаноўцы былі разгледжаны пытанні студэнцкага будаўнічага руху, вырашаны некаторыя праблемы будучага трэцяга працоўнага семестра, падведзены вынікі падрыхтоўчага перыяду. Першыя месцы ў сваіх групах занялі БДУ імя У. І. Леніна, Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, Мінскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, ГПТВ № 34.

Пройдзе яшчэ крыху часу, і асноўныя сілы байцоў у форме СБА ўступяць у бітву за эфектыўнасць і якасць студэнцкай працы. Больш за 11 тысяч студэнтаў будуць працаваць у гэтым годзе на будаўнічых аб'ектах сталічнай вобласці і г. Мінска.

**А. КАЗАК.**

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб V Рэспубліканскім і V Усесаюзным конкурсе работ маладых вучоных па грамадскіх навуках, прысвечаным 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі

1. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца аўтары выдадзеных кніг, апублікаваных артыкулаў, а таксама рукапісаў аб'ёмам не менш трох друкаваных аркушаў па марксісцка-ленінскай філасофіі, навуковаму камунізму, палітычнай эканоміі, канкрэтнай эканоміцы, гісторыі КПСС, гісторыі ВЛКСМ, міжнароднага маладзёжнага руху, гісторыі СССР, усеагульнай гісторыі, праву, псіхалогіі, педагогіцы і праблемах камуністычнага выхавання моладзі. Прадстаўленыя на конкурс работы павінны ўяўляць сабой самастойна выкананыя даследаванні па актуальных праблемах грамадскіх навук, вызначаных пастановай ЦК КПСС ад 14 жніўня 1967 г. «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве», дакументах XXIV з'езда КПСС.

2. Для арганізацыі і правядзення конкурсу ствараюцца абласныя, рэспубліканскія і ўсесаюзныя аргкамітэты, якія фарміруюць экспертныя камісіі па асобных навуках, робяць адбор лепшых работ маладых вучоных, арганізуюць іх шырокае абмеркаванне, устанаўліваюць формы заахвочвання і ўзнагароды пераможцам, арганізуюць канферэнцыі і пасяджэнні маладых вучоных па грамадскіх навуках. Рэспубліканскі аргкамітэт робіць справаздачу аб ходзе конкурсу перад Усесаюзным аргкамітэтам.

3. Конкурс праводзіцца ў два туры. Першы тур праводзіцца ў абласцях, краях, аўтаномных і саюзных рэспубліках. Права вылучэння работ маладых вучоных прадастаўляецца аддзелам, сектарам навучальных устаноў, кафедрам грамадскіх навук ВНУ, вучоным саветам, камітэтам камсамола, саветам маладых вучоных.

Пры вылучэнні на першы тур прадстаўляюцца наступныя дакументы: водзыў-рэкамендацыя, кароткая анатацыя работы, характарыстыка навуковай і грамадскай дзейнасці.

На 1 лістапада 1977 года ўзрост аўтараў не павінен быць больш як 33 гады.

Першы тур конкурсу канчаецца ў лістападзе 1977 — студзені 1978 года ў форме абласных, краявых, рэспубліканскіх нарад (канферэнцый) маладых вучоных, на якіх падводзяцца вынікі тура, узнагароджваюцца пераможцы і выносяцца рэкамендацыі аб удзельніках другога тура Усесаюзнага конкурсу.

Лепшыя работы прадстаўляюцца на другі тур конкурсу да 1 сакавіка 1978 года. Аргкамітэты саюзных рэспублік, якія маюць абласное аддзяленне,




вызначаюць парадак адбору лепшых работ маладых вучоных на другі тур конкурсу самастойна, але прытрымліваюцца парадку і тэрміну прадстаўлення.

Работы прадстаўляюцца ў рэспубліканскі аргкамітэт у двух экземплярах (для рукапісаў першы экземпляр абавязковы), з анатацыяй, характарыстыкай і водзывам-рэкамендацыяй аргкамітэта. Водзыў-рэкамендацыя зацвярджаецца на пасяджэнні абласнога камітэта і завяраецца подпісам старшыні аргкамітэта.

У кароткую анатацыю памерам не больш 2—3 старонак машынапіснага тэксту ўключаецца прозвішча, імя, імя па бацьку, поўная назва навуковай установы або ВНУ, дзе выканана работа, год напісання работы, яе аб'ём. У асноўнай частцы анатацыі раскрываюцца кароткі змест работы і яе вывады. Анатацыя падпісваецца аўтарам з указаннем яго службовага і дамашняга адрасоў і тэлефонаў. Калі на конкурс вылучаецца некалькі работ, то анатацыя складаецца на кожную работу паасобку.

У характарыстыцы навуковай і грамадскай дзейнасці аўтара абавязкова ўказваецца прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, партыйнасць, нацыянальнасць, займаемая пасада, адукацыя, асноўныя паказчыкі яго грамадскай і навуковай работы, наяўныя публікацыі.

Характарыстыка павінна быць заверана подпісамі кіраўнікоў адпавядаючай навуковай установы або ВНУ, сакратароў партыйнай і камсамольскай арганізацый.

У водзыве - рэкамендацыі ацэньваецца навуковы змест работы, выказваюцца крытычныя заўвагі і вызначаецца, па якой навуцы (з пералічаных у палажэнні аб конкурсе) данае даследаванне вылучаецца на конкурс, пералічваюцца апублікаваныя рэцэнзіі на даную работу. Калі прадстаўлена калектыўная праца, неабходна ўказаць уклад кожнага аўтара (кім і якія раздзелы напісаны і г. д.). Водзыў-рэкамендацыя зацвярджаецца на пасяджэнні рэспубліканскага, абласнога (краявога) аргкамітэта і завяраецца подпісам старшыні аргкамітэта.

Рукапісныя работы павінны быць афармлены ў адпаведнасці з інструкцыяй Усесаюзнага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі (УІНТІ) «Аб парадку прыёму, захавання і размнажэння ў абмежаваных тыражах навуковых работ», надрукаваны на машынцы праз 1,5 або 2 інтэрвалы ясным чорным шрыфтом без памылак, на белай паперы, вычытаны, адкарэкціраваны. Работы павінны складацца з тытульнага ліста, асноўнага тэксту, прылажэнняў (калі яны ёсць), бібліяграфіі, аглаўлення, павінны быць падшыты ў цвёрдых папках.

Другі тур будзе завершан ў кастрычніку 1978 года.

4. Абкомы камсамола, ЦК ЛКСМБ па ўзгадненню з мясцовымі аргкамітэтамі да 1 лістапада 1977 года прадстаўляюць у ЦК ЛКСМБ каштарыс расходаў па правядзенню канферэнцый і пасяджэнняў.

Расходы па правядзенню конкурсу нясуць арганізацыі-заснавальнікі.

Адрас рэспубліканскага аргкамітэта: Мінск, вул. К. Маркса, 40, аддзел студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМБ. Тэлефоны: 293-002, 293-970.

# НА ЭКРАНАХ... СЕСІЯ

Летняя сесія. Самая характэрная яе прыкмета — гарачыя студэнцкія спрэчкі, узбуджаныя твары, то радасныя, а парой і сумныя. Яшчэ нямнога, і будуць здадзены апошнія экзамены, на некаторы час пустымі стануць аўдыторыі. А пакуль у студэнтаў гарачая і адказная пара.

На факультэце фізікі здзіўляюча ціха. Каля дзвярэй 373-й аўдыторыі чакае студэнт: зараз яго чарга заходзіць. Здаюць спецкурс. Пытаемся: «Дзе ж астатнія? Няўжо ўсе здалі?» Ён моўчкі ўказаў на дзверы насупраць. Наша паяўленне ў аўдыторыі засталося незаўважаным. Навокал узбуджаныя твары — як заўсёды, у самы апошні момант узнікаюць спрэчныя пытанні. Скрэслена графікамі і формуламі дошка, на сталах — горы падручнікаў. Каля акна цесным колам акружылі студэнты высокага хлопца. Ён штосьці горача тлумачыць.

Знаёмімся. Мікалай Лысак, староста 5-й групы III курса фізфака.

— Мікалай, экзамены толькі пачаліся, але ці можна ўжо параўноўваць цяперашнія вынікі з вынікамі зімовай сесіі?

— Баюся, як бы вывады не аказаліся скараспелымі, але пачатак абяцаючы. Першы экзамен — філасофію — здалі без адзінай тройкі. Ды і сёння ўсё ідзе пакуль добра. Пасля зімовай сесіі сярэдні бал у нашай групе склаў 4,27. Будзем старацца не знізіць гэтыя рэзультаты, бо наша група зараз лепшая на патоку. Галоўнае, не згубіць патрэбны рытм. А нам прадстаіць яшчэ складанае выпрабаванне — экзамен па электрадынаміцы.

— Якая сесія ў гэтым навучальным годзе паказалася складанай?

— Цяжка сказаць. Калі здасі прадмет, заўсёды здаецца, што ведаеш намнога больш, чым перад экзаменам, усё здаецца лягчэй, чым раней.

...А ў суседняй аўдыторыі другакурснікі 10-й групы здавалі самы складаны, на іх думку, прадмет — оптыку. Сярод студэнтаў групы 6 замежных студэнтаў, яны стараюцца не адставаць у вучобе. Толькі на «4» і «5» вучацца чэшскія сябры.

Зусім іншая карціна на факультэце журналістыкі. У 2-й групе II курса двое не дапушчаны да здачы экзаменаў. Вынікі першага экзамена (па рускай мове) — 6 троек, дзве двойкі. Беларуская мова—адна ацэнка «нездавальняюча» і дзве тройкі. «Праславіўся» С. Ягорцаў, які атрымаў па трох прадметах нездавальняючыя адзнакі. А наперадзе яшчэ тры найбольш складаныя экзамены. Над гэтым нельга не задумацца.

Ідзем далей. Каля аўдыторыі група дзяўчат. Некаторы час назіраем за імі. Дзяўчаты вельмі ўсхваляваны, амаль не размаўляюць між сабой, а ўсё больш глядзяць у падручнікі і канспекты. Гэта першакурснікі механіка-матэматычнага факультэта. Для іх гэта другая сесія. Пакуль што з гэтымі студэнцкімі «нагрузкамі» яны спраўляюцца добра. Адстаючых у групе няма.

— Зараз мы здаём матэматычную логіку. Хвалюемся, канешне. Гэта ў нас першы экзамен летняй сесіі, а наперадзе яшчэ тры, і сярод іх самы складаны — алгебра,— гаворыць Рыта Макарэвіч.— А наогул наша група лічыцца лепшай на патоку. Трэба захаваць за сабой гэта званне.

...На факультэце біялогіі, як і ўсюды,— усхваляваныя твары студэнтаў. Падыходзім да рабят 1-й групы III курса. Яны здаюць экзамен па філасофіі. У гэты момант староста групы адказваў экзаменатару.

Вельмі спадабаўся нам настрой студэнтаў перад экзаменам — жарты, размовы аб прадстаячым экзамене па генетыцы.

Нарэшце паявіўся староста Анатоль Лярскі. Упершыню за тры гады вучобы ва універсітэце ён атрымаў тройку. І таму быў расхваляваны і засмучаны. Даем яму час прыйсці ў сябе пасля няўдачы. З размовы даведваемся, што першы экзамен (палітэканомію) у групе здалі добра — адна тройка. Ёсць у іх два выдатнікі — Алена Прасвірына і Дзіма Гельтман.

На трэцім курсе рабяты ўжо менш хвалююцца на экзаменах, адчуваюць сябе больш упэўнена, таму і здаюць лепш.

Поўнай хадою крочыць сесія па універсітэту. Але яшчэ ёсць час, каб падцягнуцца, здаць апошнія экзамены на добра і выдатна. Галоўнае, каб у студэнтаў усіх факультэтаў было шчырае жаданне вучыцца добра, атрымаць трывалыя веды. А што такое жаданне ёсць у большасці студэнтаў — мы не сумняваемся.

**А. ЛІОПА,**
**Т. ПЕТРАШКЕВІЧ.**





Спакойная абстаноўка пануе на экзамене па вышэйшай матэматыцы ў студэнтаў 5-й групы I курса біяфака. Адчуваецца, што ўсе пытанні ў атрыманых білетах першакурсікі ведаюць добра. Так лічыць і старшы выкладчык кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў Т. І. Рагачэвіч, якая прымае гэты экзамен.

Фота Т. САХАШЧЫК.

# Лекцыя або тэхніка? Лекцыя!

**Кампетэнтны, зацікаўлены лектар і ўважлівая аўдыторыя. Гэта тое, да чаго мы імкнемся і чаго не заўсёды дасягаем. Чаму?**

**Сяргей Барысавіч Бенядзіктаў — сацыяльны псіхолаг па прафесіі. 15 гадоў займаецца псіхалагічнымі даследаваннямі. Галоўным у дзейнасці выкладчыка лічыць самастойны навуковы пошук.**

**Ларыса Лявонцьеўна Кароткая мае 17 гадоў педагагічнай практыкі ў школе і 20 гадоў ва універсітэце, вынікам якіх з'яўляюцца самастойныя навуковыя даследаванні: манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, артыкулы ў часопісах.**

**З імі сёння наша інтэрв'ю.**




**Мы не перастаем здзіўляцца новым, невядомым да гэтага часу пазнавальным і пераўтваральным магчымасцям чалавека. Адно з параджэнняў яго розуму—тэхніка пранікае зараз літаральна ва ўсе сферы жыцця. Усё шырэй прымяняецца яна ў вучэбным працэсе. Дзе разумная граніца яе пашырэння? Ці не прыніжае гэта значэнне лекцыі ў вучэбным працэсе?**

**БЕНЯДЗІКТАЎ:** Укараненне тэхнічных сродкаў прыніжае значэнне недасканалай лекцыі і робіць яе поўнасцю непатрэбнай. Але фетышызаваць тэхнічныя сродкі нельга. Тэхніка сама па сабе нічога не вырашае. Апошняе слова заўсёды належыць тым людзям, якія з ёй працуюць. Каля дзесяці гадоў займаюся я тэхнічнымі сродкамі як псіхолаг і па-ранейшаму лічу, што галіна гэта недастаткова даследавана. Я— за тэхнічныя сродкі толькі там, дзе яны абсалютна незаменныя.

**КАРОТКАЯ:** Лектар павінен валодаць сваімі «тэхнічнымі сродкамі» — глыбокай верай у тое, аб чым ён гаворыць, акрыленасцю. Тэхніка ў гэтых адносінах не заменіць лектара. Акрамя таго, лекцыя расстаўляе патрэбныя акцэнты, вызначае галоўнае, істотнае. Нельга адмаўляць і выхаваўчае значэнне лекцыі. Навуковая інфармацыя перастае быць сухой, калі выкладчык сам натхнёны. Яна выхоўвае патрыятычны дух, гонар за айчынныя адкрыцці.

**У век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ўсё большае значэнне набывае набліжэнне навуковай інфармацыі да жыцця, практычнае прымяненне атрыманых ведаў. Як павінен лектар арыентаваць свае задачы ў гэтым плане?**

**БЕНЯДЗІКТАЎ:** Тым маяком, на які павінен арыентавацца выкладчык, з'яўляюцца праблемы, што паўстаюць перад цяперашнімі студэнтамі па заканчэнні ВНУ. Тут ставіцца на першы план задача строгага адбору навуковай інфармацыі, бо тое, што актуальна ў момант навучання, потым можа аказацца менш актуальным. Вялікае значэнне набываюць адбор інфармацыі і яе акцэнтоўка. Навуковая інфармацыя павінна ўспрымацца як жывое дзеянне канкрэтных людзей з іх мэтамі і захапленнямі. Выкладчык павінен перадаць пачуццё сацыяльнай адказнасці за сваю работу.

**Як бачым, задачы лектара— вялікія і шматгранныя. Эфектыўнасць яго намаганняў залежыць у многім ад працаздольнасці і зладжанасці сістэмы лектар — аўдыторыя. Што, павашаму, вызначае аўтарытэт лектара ў аўдыторыі?**

**КАРОТКАЯ:** Не апошняе месца ў рабоце лектара, у эфектыўнасці яго намаганняў займаюць такія, другарадныя на першы погляд якасці, як майстэрства вызначыць, падкрэсліць галоўнае, інтанацыя, дыкцыя, уменне ўставіць, дзе патрэбна, жарт, звязаць лекцыю з надзённымі праблемамі сучаснасці, з тым, што хвалюе моладзь сёння. Студэнт павінен адчуваць перакананасць лектара ў тым, аб чым ён гаворыць. Бадай, не памылюся, што вельмі важным ў дзейнасці выкладчыка з'яўляецца самастойная навуковая творчасць. За гэтым стаіць не толькі яго агульная эрудыцыя, але і ўменне адкрываць студэнтам шляхі навуковых пошукаў.

**БЕНЯДЗІКТАЎ:** Так, даследаванні ленінградскіх псіхолагаў выявілі, што вядучае ў рабоце лектара — самастойны навуковы пошук. Калі ён як даследчык робіць нешта самастойнае і арыгінальнае, то гэта цалкам вызначае яго аўтарытэт у аўдыторыі. Нярэдка аўтар выклікае да сябе сімпатыю як чалавек, працаўнік, і толькі. Найбольш падрыхтаваная частка студэнтаў імкнецца ацэньваць інфарматыўнасць лектара, а не яго асабістыя якасці. Лектар як асоба не павінен быць на першым плане, а прадмет—на другім.

**Якія крытэрыі зместу лекцыі аднеслі б вы на першы план?**

**БЕНЯДЗІКТАЎ:** Сапраўдная навізна, актуальнасць і праблематычнасць — вось тыя крытэрыі. Не паведамляць старыя ісціны, а паведамляць кожны раз новае.

**КАРОТКАЯ:** Мне застаецца дапоўніць толькі, што рэакцыя аўдыторыі—своеасаблівая «лакмусавая паперка» на змястоўнасць лекцыі.

**У чым вы бачыце розніцу ў методыцы выкладання на малодшых і старэйшых курсах?**

**БЕНЯДЗІКТАЎ:** На малодшых курсах большае значэнне маюць знешнія эфекты. Тут розніца вялікая, але гэтым яна і абмяжоўваецца.

**Ваша мадэль ідэальнага студэнта?**

**КАРОТКАЯ:** дапытлівасць, мэтанакіраванасць, эрудыцыя і актыўная жыццёвая пазіцыя складаюць воблік сучаснага студэнта. Але гэта не абстрактная мадэль, а новыя людзі, з якімі я працую.

**А. ГУБІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# ШКОЛА КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

Часта перад камсамольскім актывістам узнікае мноства пытанняў. Як правесці пасяджэнне, сход, палітінфармацыю, гутарку, вечар? Як выпусціць насценгазету, што асвятліць у ёй у першую чаргу, а што паставіць на другі план? Як лепш арганізаваць культпаход у музей, тэатр, кіно? Як весці тую, ці іншую дакументацыю і шмат іншых. Наколькі шматгранная работа актывіста, столькі і пытанняў, якія яму трэба вырашыць. І нярэдка, асабліва маладыя, нявопытныя камсоргі, члены камсамольскіх бюро груп, палітінфарматары і іншыя актывісты пры правядзенні мерапрыемстваў губляюцца, блытаюцца, і ў выніку мерапрыемства праходзіць не на належным узроўні.

Як навучыць камсамольскіх актывістаў арганізатарскаму майстэрству?

Гэта пытанне паставілі на камітэце камсамола гістарычнага факультэта БДУ. І вырашылі: «Створым школу камсамольскага актыву».

Было гэта ў кастрычніку 1976 года. Нямнога часу прайшло, як тут працуе першая і пакуль што адзіная ва універсітэце школа, дзе камсамольскія кіраўнікі вучацца быць добрымі і ўмелымі арганізатарамі, знаўцамі камсамольскіх спраў.

— Задача школы, — гаворыць адзін з яе арганізатараў, член камітэта камсамола факультэта Вера Сяргеенкава, — падрыхтаваць кваліфікаваных, ведаючых сваю справу камсамольскіх актывістаў.

Вучэбным працэсам школы камсамольскага актыву кіруюць яе дырэктар — выкладчык кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму П. Н. Савасцёнак, завуч — выкладчык кафедры навуковага камунізму А. Байгародаў і адказная за сектар інфармацыі і кантролю камітэта камсамола аспірантка кафедры гісторыі СССР В. Сяргеенкава. Яны складаюць планы заняткаў, запрашаюць лектараў, сочаць за наведваннем. У школе займаюцца 316 студэнтаў. Гэта камсоргі груп і курсаў, члены камсамольскіх бюро груп, праforгі, рэдактары і члены рэдкалегій насценных газет, спартыўныя арганізатары, старасты курсаў і груп, члены студэнцкага навуковага таварыства і інш.

Школа мае чатыры факультэты. На першым займаюцца камсамольцы, якія адказваюць за ваенна-патрыятычную і ідэалагічную работу, а таксама за інтэрнацыянальныя сувязі. Гэта члены групы «Доўг», клуба інтэрнацыянальнай дружбы. Слухачоў вучаць, як лепш прачытаць лекцыі, арганізаваць гутарку, правесці вечар.

Другі факультэт — гэта той, на якім работнікі Кастрычніцкага РК ЛКСМБ і камітэта камсамола універсітэта расказваюць сакратарам камсамольскіх бюро груп і курсаў, адказным за сектар інфармацыі і кантролю, за ўліковыя сектары аб тым, як правільна весці пратаколы, складаць планы работы, весці пасяджэнні і сходы.

Пытанні вучобы і навуковай дзейнасці асвятляюцца на трэцім факультэце. Тут займаюцца старасты, адказныя за навуковую работу, за акадэмічную паспяховасць, члены студэнцкага навуковага таварыства. Вопытныя выкладчыкі даюць ім парады, як зацікавіць студэнтаў навуковай дзейнасцю, палепшыць паспяховасць у групе і на курсе, арганізаваць пасяджэнне гуртка СНТ і інш.

На апошнім, чацвёртым факультэце займаюцца камсамольцы, якія адказваюць за культурна - масавыя сектары, шэфскія сувязі, спартыўную работу, рэдактары і члены рэдкалегій насценгазет. Слухачам гэтага факультэта растлумачваюць, як праводзіць розныя культурна-масавыя мерапрыемствы, спартыўныя спаборніцтвы, даюць метадалагічныя ўказанні па выпуску насценгазет. За час існавання школы ўжо пяць разоў праводзіліся заняткі. Вучоба плануецца такім чынам: спачатку збіраюцца ўсе слухачы, і ім чытаюць агульную лекцыю. Затым разыходзяцца па факультэтах, і там ужо разглядаюцца пытанні ў адпаведнасці з факультэцкім планам. Напрыклад, былі прачытаны лекцыі «XXV з'езд аб цэнтральнай задачы камсамола», «XXV з'езд аб развіцці вышэйшай адукацыі», «Методыка арганізацыі вечароў адпачынку» і шэраг іншых. На занятках былі разгледжаны пытанні па правядзенню Ленінскага заліку, па далейшаму вывучэнню рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ і XVII з'езда ВЛКСМ.

На кожных занятках даюцца практычныя ўказанні актывістам, гэта значыць правілы вядзення і запаўнення дакументацыі, методыка правядзення мерапрыемстваў, вызначаюцца планы на бліжэйшы час.

А ці ўсім актывістам дапамагае школа? Вядома, што яна карысна навічкам у камсамольскай рабоце. Але «ветэранам» яна можа не патрэбна?

— Патрэбна, — лічыць член камітэта камсамола факультэта Вера Сяргеенкава,—бо жыццё не стаіць на месцы. Нешта змяняецца, паяўляецца новае. І часта бывае, што без вопытнага кіраўніка не разбярэшся. А тут выкладаюць вельмі вопытныя настаўнікі — прафесары, кандыдаты навук, адказныя камсамольскія работнікі.

Добрая ініцыятыва паявілася на гістарычным факультэце. Высока адзываюцца аб карысці школы сакратар камітэта камсамола Валерый Левашэвіч, старшыня прафсаюзнага бюро Віктар Старыкаў, слухачы школы сакратар камсамольскага бюро другога курса аддзялення гісторыі Генадзь Храповіч, яго намесніца Таццяна Шаніна, сакратар камсамольскага бюро аддзялення палітэканоміі Уладзімір Дзямідчык і многія іншыя.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі работы школы сектару кантролю і інфармацыі камітэта камсамола аказваюць дэкан факультэта Іраіда Восіпаўна Царук, сакратар камітэта камсамола Валерый Левашэвіч, намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце Насця Мажэйка.

У працэсе работы школы выявіліся і недахопы, якія можна абумовіць «цяжкасцямі росту». Напрыклад, на апошнім пасяджэнні камітэта камсамола было ўзнята пытанне аб тым, каб факультэты падзяліць на секцыі, таму што часта неабходна больш дыферэнцыраваць заняткі. Адпаведна з гэтым пытаннем было прапанавана і больш удакладняць планы.

Школа працуе першы год. Зроблена ўжо некалькі крокаў. Наперадзе іх будзе шмат. Але можна быць упэўненымі, што гэтыя крокі стануць карыснымі для камсамольскага актыву.

Мы расказалі аб добрым пачынанні камсамольцаў гістарычнага факультэта БДУ. Думаецца, што і ў іншых камсамольскіх арганізацыях ВНУ і прадпрыемстваў можна стварыць такія школы. А карысць ад іх відавочная.

**Ф. БАРОДКІНА,**
**Я. ДУБРОЎСКІ.**





Экзамен па тэарэтычнай фізіцы прымае ў студэнтаў 1-й групы II курса хімфака дацэнт кафедры будовы рэчыва У. С. Каралькоў.
Фота Т. САХАШЧЫК.

## Газета выступіла

# РАСПАЧАЛІ ГУЛЬНЮ

**Першага красавіка ў сатырыка-гумарыстычным аддзеле «Кафедры агульнага смехаробства» была надрукавана крытычная заметка, у якой паведамлялася аб факце грубага парушэння правілаў абслугоўвання наведвальнікаў буфетчыцай С. Уманскай у інтэрнаце № 2. Матэрыялы рэдакцыйнай праверкі гэтага факту былі накіраваны на рэагаванне ў Першамайскі трэст сталовых і рэстаранаў. На днях рэдакцыя атрымала адказ за подпісам нам. дырэктара трэста, дзе паведамляецца, што справа С. Уманскай разгледжана, прычым высветлілася, што тую каўбасу, якую буфетчыца прадавала студэнтам па завышанаму кошту, апошняя са склада не атрымлівала. Дырэкцыя палічыла гэта абставінай, якая юрыдычна апраўдвае ашукальніцу, і абмежавалася пераводам С. Уманскай на іншае месца работы ў сферы абслугоўвання. Між іншым, тое, што буфетчыца прадавала прадукты, якія не стаяць нідзе на уліку, на думку рэдакцыі, робіць справу тым больш падсуднай. Нам застаецца дадаць, што ў гульню «кошкі-мышкі», якую распачала дырэкцыя трэста, гуляць ніхто не збіраецца. Рэдакцыя лічыць сваім абавязкам заўважыць кіраўнікам трэста, што гэты факт павінен быў атрымаць больш аб'ектыўную ацэнку і мець сапраўды юрыдычны падыход з іх боку.**



●

Кабінет гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў на працягу ўсяго навучальнага года—добры і надзейны сябар студэнтаў. Але надзвычай ясна гэта адчуваецца ў перыяд сесіі.

Фота **Т. Сахашчык.**

●

# КНІГА Ў ТВАІХ РУКАХ

У бібліятэцы БДУ імя У. І. Леніна заўсёды шмат чытачоў. Гэта і зразумела: адкрыты доступ да асноўнай літаратуры зручны і эканоміць час, дзелавая атмасфера настройвае на рабочы лад. Фонд бібліятэкі на першае студзеня 1977 года налічвае 1 377 228 друкаваных адзінак. Салідная лічба. З кожным годам яна расце. Але побач існуе яшчэ адна лічба, не менш красамоўная: штогод чытачы універсітэцкай бібліятэкі губляюць каля 1000 тамоў. Кнігі, якія прапануюцца ўзамен, часта не адпавядаюць каштоўнасці згубленых.

Ёсць у бібліятэкі асобая катэгорыя чытачоў, так званыя «чытачы-запазычнікі». Яны не наведваюцца ў бібліятэку па году, па два, па тры. Часта гэта студэнты вячэрняга і завочнага аддзяленняў, крыху радзей — дзённага. Праглядаем фармуляры: М. Мішына не вярнула кнігі, узятыя ў 1973 г., А. Гарошкаў — у 1973-74, Т. Магілявец — у 1973-74, С. Несцярэнка — у 1974-75. Спіс можна працягваць. Непрыгожы факт: сярод выкладчыкаў і аспірантаў, якія павінны паказваць ва ўсім прыклад студэнтам, таксама нямала запазычнікаў.

З-за такіх чытачоў работнікі бібліятэкі пастаянна ўключаюць у план сацыялістычных абавязацельстваў такі пункт: «Работа па ліквідаванню запазычанасцей». Работа гэта прадугледжвае масу непрыемных мерапрыемстваў: ад вусных напамінаў, папярэджанняў да пісьмовых паведамленняў на адрас дэканата, штрафаў, пазбаўлення права карыстання бібліятэкай на год. Каб выправіць становішча, работнікі бібліятэкі павінны былі ўвесці наступны прынцып абслугоўвання: пакуль хоць адзін студэнт не вярнуў усе ўзятыя кнігі — усёй групе літаратура не выдаецца. З аднаго боку, можа і не патрэбна было б заклікаць да сумленнасці кожнага, а з другога — дзейсна. Плануецца таксама ўвесці абходны ліст для студэнтаў кожнага курса. Да гэтага часу ён існаваў толькі для пяці- і шасцікурснікаў.

Існуе і яшчэ адна праблема, якой не павінна быць. Усе, канешне, бачылі ў чытальнай зале студэнцкай бібліятэкі таблічку з надпісам: «Чытач, доступ да кніг заснаван на глыбокім даверы да ўсіх». Яна прызначана для «кніжных чарвякоў»— такой крыўднай мянушкай наклеі супрацоўнікі бібліятэкі некаторых чытачоў. Яны таго заслугоўваюць...

Перада мной тры кнігі. Чыстыя, не парваныя. Некаторыя старонкі акуратна падклеены, але гэтыя падручнікі, на жаль, ужо ніколі не вернуцца на паліцу бібліятэкі. Свежы след клею на пераплёце пакінут нядобразычліўцамі. Рукі злодзея бязлітасна вырвалі ўсе старонкі, пакінуўшы вокладку. Унутр ўмела ўклеены старонкі з іншай кнігі. З горыччу глядзіш на гэты сумны вопыт.

Дзевяць гадзін вечара. Вы сядзіце ў бібліятэцы. Праз гадзіну чытальную залу закрываюць. Засталося старонак восемдзесят. Не паспець. Заўтра экзамен. «Ладна, раніцай забягу»,— так думае большасць. Але не ўсе. Вось логіка найбольш «кемлівых»: «Падумаеш, некалькі старонак вырву — не збяднеюць» ці: «Непрыемна, але што зробіш?» Адзін не разумее і рве, другі разумее, саромеецца(!) — але таксама рве. Вынік адзін. На паліцах застаюцца сапсаваныя кнігі, якімі заўтра ўжо не змогуць карыстацца іншыя студэнты. А ў зале ж сядзім мы з вамі і нашы таварышы. Добрыя, сумленныя людзі. Часта бачым, як нехта побач узмахнуў над кнігай лезвіем брытвы ці проста вырваў старонку, стараючыся не шумець. Бачым і... маўчым. Тым самым становімся саўдзельнікамі. Адкуль жа ў нас гэта мяшчанскае нежаданне ўмешвацца, боязь назваць шкодніка — шкоднікам? Правільна гаворыць Бруно Ясенскі, што самае вялікае няшчасце на зямлі — абыякавасць.

XX век. «Кніжны бум». Чэргі ля прылаўкаў магазінаў, чэргі ў бібліятэках. Праз 200 гадоў усю нашу планету можна будзе пакрыць бумажнай коўдрай таўшчынёй ў паўметра. І ўсё роўна кніг не хапае. Выхад? Мала любіць кнігу — трэба яе берагчы.

**І. ЖУК,**
**студэнтка II курса журфака.**




А. ПІСЬМЯНКОЎ.

## СЯБРУ

**Прыйшло натхненне не само,
Не з божай завітала міласці —
Я атрымаў тваё пісьмо —
І ў твар дыхнула цёплай
шчырасцю.
Бягуць няроўныя радкі,
Бягуць то з сумам, то вясёлыя.
Здаецца, бачу ўсцяж ракі
Я сосны нашы меднастволыя.**

**...Ты ж па-ранейшаму такі...
Здаецца, зараз набалелыя
З-пад сэрца вырвуцца радкі
І паляцяць, як гусі белыя.**

* * *

Прагну свежасці і ветру,
Хай парушаць мой
спакой!
Рэжце,
ластаўкі,
паветра
Над угрэтаю зямлёй.
Раскудлач жа,
вецер,
грушу.
Усхвалюй і ўстрывож!
Ну, паплач мне,
неба,
лужу,
Каб прабегчы басанож...

* * *

**Як не хапае ў страве солі, —
Яна губляе прысмак свой.
...У песні выйшла многа болю,
А мала мужнасці людской.**

**Ў радкі напісаныя веру,
І ўсё ж напісанае рву...
Зноў лягуць словы на паперу,
Нібы расінкі на траву.**

* * *

Не быў зайздроснікам ніколі,
І да высновы ўраз прыйшоў, —
Што жаўруку зайздрошчу
ў полі
За дзіва-музыку без слоў.
Зайздрошчу рэчцы за
імклівасць,
Бяжыць так шпарка колькі год!
Пчале зайздрошчу за
руплівасць
І шчыра дзякую за мёд.

* * *

**Што ні дзень — хаджу
па лесе,
Зноў у думках я адзін.
Сэрца прагне новых песень,
Бы бярозанькі — хусцін.**

**Аб чым думаю, гадаю,
На чые гляджу сляды!
Што згубіў я, што шукаю,
Летуценнік малады!**

**Лес паэмы мне раскажа,
Сцежка ў казку павядзе...
— Закахаўся—цёткі кажуць, —
Бачна, хлопец прападзе!**



Дзм. ТАРАСАЎ

* * *

**«Прими мое
благословенье...»—
Поет отец, седой и слабый,
Без сыновей — отец, без
славы —
В своем святом уединеньи.
Без дней грядущих,
укоризну**

**Судьбе воздавший невеселой,
Ведет отец во имя Жизни
С Землею смешанное соло.
«Прими мое благословенье...»
Трезвеет дымное застолье,
Встает щемящее виденье:
Дорога вьется через поле,**

**И за околицей, зарею
От сна оторванный тревожно,
Старик дрожащею рукою
Путь осеняет молодежный —
«Прими мое благословенье...»
А сын за энным поворотом
С одной четвертой частью
роты
Не встал при первом
отступленьи.**

**Поет отец,
во дни и годы
Слова, вошедшие, как в сердце
второго сына —
сталь похода...**

**Слова на музыку бессмертья.
«Прими мое благословенье...»
О, мир чудовищной неласки! —
И третий —
в двадцать от рожденья —
Упал ничком с пробитой
каской...**

**Не о войне, не о расплате
В последний раз, так может
статься,
Поет отец в отцовской хате,
Где больше детям не
рождаться.
«Прими мое благословенье...»**

А. УСЕНЯ

**ПЕРАМОГА**

Чаканыя салюты Перамогі!..
Прыйшоў салдат
Да роднага сяла,
Стаяў салдат —
Сышліся ўсе дарогі,
Маўчаў салдат —
Сляза з вачэй цякла...

Упаў салдат
І кветкі на ўзлеску,
Адчуў салдат
Шчаслівую пралеску
І прышпіліў,
Як ордэн,
На грудзях...

**ЛАПЦІ**

На хвіліну ціха стала ў хаце,
Калі дзед таемна, нерухава
Даставаў запыленыя лапці —
Аддаваў унукам на забаву...

Іх цяпер не знойдзеш і ў музеі
Сярод розных рознасцей
славутых.
Мы на лапці здзіўлена глядзелі,
Быццам гэта царскі быў
абутак...

В. БАРЫСЕВІЧ

**МАРА**

**Хай будзе шлях мой
цяжкі —
Няходжаны прасцяг.
Не трэба мне паблажкі
Ніякай ад жыцця.**

**Здаўна я сваю мару,
Вось гэтую, таю —
Уліцца паўнапраўна
Ў студэнцкую сям'ю.**

* * *

Т. ЧАРНАВУС

Паднялі рамонкі
Белыя павейкі —
І здалося хлопцам
На хвіліну нейку,
Быццам бы не кветак
У тым лузе многа,
Быццам бы дзяўчынкі
З класа выпускнога
Перапынак будзяць
Бестурботным смехам...

На парозе восень —
І... рамонак меней.



«НА ПРАГУЛЦЫ!». Фота Т. КУДРЫЦКАЙ.

## АКТУАЛЬНЫ ДАПАМОЖНІК

Новая кніга дацэнта кафедры беларускай літаратуры кандыдата філалагічных навук М. Б. Яфімавай «Літаратурныя вечары ў школе» выйшла ў выдавецтве «Народная асвета». Гэты дапаможнік дае выкладчыкам беларускай літаратуры багаты матэрыял для арганізацыі пазакласнай работы ў школе. У дапаможніку — два раздзелы. У першым з іх разглядаюцца пытанні методыкі правядзення літаратурных вечароў у школе, у другім — практычнае ажыццяўленне вечароў падаецца з выкарыстаннем багатай спадчыны майстроў беларускай мастацкай літаратуры.

У разнастайнай і шматграннай сістэме пазакласнай работы па літаратуры аўтар вылучае два віды літаратурных вечароў: паводле іх мэты і зместу. Гэта літаратурныя вечары, прысвечаныя ўслаўленню гісторыка-рэвалюцыйных падзей, якія адбываліся ў нашай краіне.

Наша рэспубліка, як і ўся Савецкая краіна, рыхтуецца адзначыць 60-гадовы юбілей Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вельмі дарэчы ў дапаможніку прадстаўлен матэрыял з беларускай мастацкай Ленініяны, пра бессмяротнасць і веліч ленінскіх ідэй, пра маральны воблік нашага маладога сучасніка, наш грамадскі лад жыцця, пра выбар прафесіі, грамадскае прызначэнне чалавека, пра барацьбу за мір.

У мэтах вырашэння комплекснага падыходу ў выхаванні і навучанні ў дапаможніку падкрэсліваецца неабходнасць аб'яднання намаганняў школы, камсамольскай і піянерскай арганізацый, іх арганічнага адзінства. Каб пазбегнуць аднастайнасці, аднапланавасці і фармалізму ў арганізацыі літаратурных вечароў і іншых самадзейна-творчых мерапрыемстваў, прапануюцца наступныя формы і тыпы: вечар шырокай праграмы; вечар камбінаванай пабудовы; літаратурныя і літаратурна-музычныя кампазіцыі; літаратурны мантаж; вечар пытанняў і адказаў; вусны часопіс. Кожнай з гэтых форм даецца грунтоўнае метадычнае тлумачэнне.

Трэба лічыць адметнай асаблівасцю гэтага дапаможніка тое, што ў ім вылучаны на першы план такія змястоўныя літаратурна-мастацкія кампазіцыі: «Я слаўлю Леніна, я Леніна пяю», «Ты, партыя, для ўсіх маяк, высокі, горды і агністы», «Кастрычніка нязгаснае святло».

Кожная з гэтых кампазіцый удала вырашаецца ў структурных, кампазіцыйных і нават рэжысёрскіх адносінах.

Літаратурна-музычная кампазіцыя «Я слаўлю Леніна, я Леніна пяю» малюе вобраз правадыра рэвалюцыі, заснавальніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Рысы бессмяротнага вобраза дапаўняюцца матэрыяламі наступных мантажоў і кампазіцый. Аўтар метадычнай распрацоўкі выкарыстала шматлікія мастацкія крыніцы з беларускай, рускай і ўкраінскай літаратур. Характэрна, што ў гэтых кампазіцыях вобразы У. І. Леніна, Камуністычнай партыі і Радзімы падаюцца ў арганічным адзінстве эстэтычнай, мастацкай формы і зместу як вобразы агульнанародныя, глыбока нацыянальныя. Тэма рэвалюцыі, Леніна і народа ў беларускай літаратуры, як і ў літаратурах брацкіх народаў, набыла характар мастацкай эстэтычнай традыцыі.

У літаратурна-мастацкіх кампазіцыях выкарыстоўваюцца творы А. М. Горкага, У. Маякоўскага, якія з'явіліся пачынальнікамі савецкай літаратурнай Ленініяны. Творы гэтых мастакоў з'явіліся ідэйнай і мастацкай асновай для развіцця літаратурнай Ленініяны Беларусі. У літаратурна-музычнай кампазіцыі «Я слаўлю Леніна, я Леніна пяю» падкрэсліваецца інтэрнацыянальны, гуманістычны пафас ленінскай тэмы ў беларускім мастацтве. Творы М. Чарота, А. Александровіча, П. Броўкі, А. Вялюгіна, К. Буйло, Г. Бураўкіна, якія выкарыстоўваюцца іменна ў гэтым мантажы, з асаблівай мастацкай выразнасцю малююць вобраз правадыра ў духоўнай еднасці з народнымі масамі, партыяй.

Метадычны дапаможнік М. Б. Яфімава «Літаратурныя вечары ў школе» адпавядае надзённым патрэбам школы і таму заслугоўвае пільнай увагі і падтрымкі з боку органаў народнай асветы, шматлікіх педагагічных калектываў школ, настаўніцкай грамадскасці.

**М. МАЛОЧКА,
выкладчык беларускай мовы
і літаратуры сярэдняй школы.**

ЭЦЮД

## КОЦІКІ

Мы не сустрэліся з табой гэтай вясной. А яна прыйшла нечакана і нясмела. І зноў цвіў бэз, кружылася галава ад густога пахучага вясенняга паветра, і зноў бударажылі сэрца жаўрукі сваім пералівным спевам... А неба было блакітнае-блакітнае, як твае вочы...

А на балоце цвілі «коцікі». Як і тады, год назад. Усяго толькі год...

Дык чаму ж ты не прыйшла, мая сінявокая Вяснянка? А ты была ўпэўнена, што мы сустрэнемся. Ды толькі не сустрэліся.

...Я стаяў на тым месцы, дзе год назад мы былі разам. Сонца сляпіла вочы, купаючыся ў празрыстых лясных лужынах, высока над галавой заліваліся жаўрукі... А я чакаў, што ты раптам вынырнеш з глыбіні лесу, паявішся перада мной з галінкамі тоўстых пушыстых «коцікаў», такая ж простая і недаступная — мая дзіўная і адзіная Вяснянка. І можа тады я асмелюся сказаць тое, што не сказаў год назад, той вясной.

Ты памятаеш яе?

Для нас яна была семнаццатая, самая шчаслівая, непаўторная, наша вясна...

Я тады ўпершыню ўбачыў, што вочы твае такія ж глыбокія і чыстыя, як вясновае неба. І мне так хацелася сказаць табе аб гэтым. І ўсё ж аднойчы я падпільнаваў цябе, калі ты адна ішла са школы. Колькі мы потым смяяліся, успамінаючы, як я напалохаў цябе, нечакана высунуўшыся з кустоў алешніку. Ты несла ў руках калматыя жоўтыя «коцікі» і ціхенька чытала вершы. І ад такой нечаканасці ты міжволі ўскрыкнула, і галінкі «коцікаў» паляцелі прама ў ваду. Мы разам кінуліся іх ратаваць, але ўжо было позна...

Я не здагадаўся іх тады сам прынесці табе, прабач. Цяпер прынёс, але, напэўна, позна...

Ішлі па лесе і маўчалі. І было добра ісці і маўчаць разам. А потым, успомніўшы, як кінуліся ратаваць «коцікаў», рассмяяліся...

Мы былі ў дзесятым. Не верыцца, што было гэта толькі год назад...

Вясна... Вясна. Мы не забудзем яе. Не можам забыць.

Ты ж не прыйшла, мая Вяснянка... Чаму?

Па дарозе, не спяшаючыся, узрушаныя і шчаслівыя, ішлі двое. Ад нечаканасці я нават устрапянуўся: у яе руках былі галінкі пахучых камячкоў-«коцікаў»...

Я глядзеў ім услед доўга-доўга. Побач, зусім блізка, пахлі «коцікі».

Т. МАНЁНАК.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 04273 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 1051.